**ACTA ALBARUTHENICA 25: 2025**
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Palina Masliankova, 2025
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne 4.0 PL (CC BY-NC 4.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.25.17

**Паліна Маслянкова ♦ Palina Masliankova**

незалежная даследніца ♦ independent researcher
ORCID: https://orcid.org/0009-0006-2346-554X
e-mail: palina.masliankova@gmail.com

## Вадзім Шклярык. 2024. *Як гавораць беларусы*. Мінск: Тэхналогія. 34 с.

Выданне Вадзіма Шклярыка "Як гавораць беларусы" сталася важнай падзеяй для беларускай папулярнай лінгвістыкі апошніх гадоў, калі грамадскі запыт на даступныя, навукова-папулярныя і нацыянальна арыентаваныя тэксты істотна павялічыўся. Першае выданне, якое з'явілася ў 2024 годзе, разляцелася за некалькі месяцаў, і ў 2025 годзе было дадрукавана другое выданне, што сведчыць пра камерцыйны поспех кнігі. У чым жа моўна-адукацыйны патэнцыял сучаснага нон-фікшна пра беларускую мову?

Кніга "Як гавораць беларусы" – гэта не проста збор асобных лінгвістычных фактаў, адвольна абраных аўтарам, але лагічна збудаваны і добра прадуманы інтэрактыўны гайд па мове беларусаў. Ён вызначаецца выразнай навукова-папулярнай арыентацыяй, спалучаючы навуковую дакладнасць і даступнасць выкладу, што робіць яго прывабным як для спецыялістаў, так і для шырокага чытача.

Аўтар выдання Вадзім Шклярык – кандыдат філалагічных навук, былы старшы навуковы супрацоўнік аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Дзякуючы Вадзіму Шклярыку паўстаў адукацыйны відэапраект "Мова: як гаворыць краіна", у межах якога аўтар вандраваў па Беларусі, апытваў мясцовых старажылаў і запісваў адметныя слоўцы вясковых бабуль. Кніга "Як гавораць беларусы", якую можна назваць своеасаблівым падсумаваннем экспедыцый, была натхнёная падрыхтоўкай матэрыялу пра беларускія гаворкі для падлеткавага часопіса "Качели". Магчыма, менавіта таму кніга атрымалася такой сучаснай паводле зместу і афармлення.

Прыемна ўражвае і прафесіяналізм усёй каманды: мовазнаўца Зміцер Санько рэдагаваў кнігу, навуковыя кансультацыі давалі доктар філалагічных навук Святаслаў Вербіч, кандыдат гістарычных навук

Зміцер Сяўрук, кандыдаты філалагічных навук Сяргей Запрудскі, Міхась Тарэлка і Вікторыя Голубева. Суаўтаркай гэтай кнігі стала беларуская мастачка Надзея Леановіч, чые выявы архітэктурных помнікаў з розных куткоў Беларусі дапаўняюць аповед, дазваляюць воку адпачыць і атрымаць задавальненне ад колеравых спалучэнняў, але не адцягваюць увагі ўласна ад тэксту, які ў гэтай кнізе адыгрывае першасную ролю. Трэба адзначыць і гарманічны дызайн выдання ад выдавецтва "Тэхналогія", у якім шмат паветра, старонкі не перагружаныя тэкстам ды іншымі графічнымі элементамі. Магчыма, філолагу хацелася б больш мапаў і прыкладаў, але, трэба аддаць належнае аўтару, яму ўдалося не перагрузіць чытача – кніга лёгка чытаецца за адзін вечар або маленькімі дозамі па адной старонцы на дзень.

Кніга запаўняе відавочную лакуну: нягледзячы на наяўнасць грунтоўных акадэмічных прац, блізкіх па тэматыцы, беларускай навукова-папулярнай літаратуры пра мову недастаткова. Пра сувязь беларускай літаратурнай мовы з дыялектамі пісалі больш за 50 гадоў таму Фёдар Янкоўскі ("Роднае слова" 1967) і Аляксандр Крывіцкі ("Наша родная мова" 1973). Зміцер Санько, галоўны рэдактар выдавецтва "Тэхналогія", у відэа пра гісторыю стварэння кнігі падкрэсліў, што падчас яго вандровак па Беларусі носьбіты дыялектаў часта выбачаліся за тое, што іх мова нячыстая, мяшаная, мабыць, параўноўваючы сваю гаворку з літаратурнай мовай. У грамадстве пануе стэрэатып, што вяскоўцы гавораць на "трасянцы", хаця найчасцей гэта дыялект, а дыялекты – грунт і крыніца папаўнення беларускай літаратурнай мовы. Кніга Вадзіма Шклярыка разбурае гэты стэрэатып і простай мовою тлумачыць, як сфармавалася беларуская літаратурная мова і якая роля дыялектаў у яе стварэнні.

Структурна кніга складаецца з трох кароткіх, але насычаных раздзелаў. Першы з іх прысвечаны сістэматызацыі найбольш характэрных адрозненняў беларускай мовы ад суседніх усходнеславянскіх. Аўтар звяртае ўвагу на фанетычныя (зацвярдзелы *р*, дзеканне і цеканне), граматычныя (асаблівасці скланення, супрацьпастаўленне *два/дзве*, формы займеннікаў) і сінтаксічныя (канструкцыі тыпу *дзякаваць каму*, *захварэць на*, *смяяцца з каго*) рысы. Выкарыстанне аўтарскіх аналогій – напрыклад, параўнанне гістарычнай фіксацыі зацвярдзення гука *р* з першымі летапіснымі згадкамі гарадоў – дазваляе перадаць дынамічны характар моўных працэсаў і зрабіць аповед эўрыстычна насычаным.

Важным элементам першага раздзела выступае шырокае прыцягненне фонавай інфармацыі, што пашырае межы ўласна мовазнаўчага апісання. Аўтар звяртае ўвагу на ролю беларускіх татараў у гісторыі пісьмовай фіксацыі фанетычных асаблівасцяў мовы, указваючы на ўнікальныя знакі, якімі ў кітабах перадаваліся гукі, характэрныя для

беларускага маўлення. Важная і згадка пра з'яўленне асобнай літары для гука [ў] спачатку ў лацініцы, а потым ужо і ў кірыліцы. Такія ўстаўкі робяць кнігу не толькі даведнікам пра моўныя адметнасці, але і культурна-гістарычным нарысам.

Другі раздзел прысвечаны дыялектнай аснове беларускай мовы, што ў кантэксце сучасных дыскусій пра стратэгіі нарматворчасці мае асаблівую актуальнасць. Аўтар паказвае, што многія нормы ўзнікалі ў сітуацыі канкурэнцыі розных тэрытарыяльных варыянтаў і часта замацоўвалі не самыя распаўсюджаныя, а лакальныя формы (напрыклад, аканне, мужчынскі род слова *яблык* або асобныя варыянты творнага, меснага і давальнага склонаў). Праз аналіз гэтых працэсаў В. Шклярык фактычна прапаноўвае канцэпцыю моўнай разнастайнасці, успрымаючы лексікаграфію як сферу, якая павінна адлюстроўваць багацце беларускіх гаворак, а не скарачаць яе да межаў адзінай нормы. Аўтар ухваляе дадаванне ў слоўнікі варыянтаў, сінонімаў і цікавых лакальных словаў, такіх як *жупіць (размаўляць), цяпельца (вогнішча), скочка (блыха), крушня (куча каменя), дрэнчыць (не даваць спакою)* і інш. Вадзім Шклярык мяркуе: "Атрымаўшы з часам статус паўнавартасных нарматыўных адзінак, гэтыя словы зробяць сучасную беларускую літаратурную мову яшчэ больш адметнай". Такая пазіцыя карэктна суадносіцца з сучаснымі падыходамі да апісання жывых нацыянальных моваў, дзе дыялектнае багацце разглядаецца як неад'емная частка літаратурнай традыцыі.

Трэці раздзел, прысвечаны асаблівасцям беларускіх гаворак, вылучаецца адметнай мастацкай арганізацыяй. Адмаўляючыся ад суровай акадэмічнай структураванасці і аддаючы перавагу эсэістычнаму аповеду, аўтар надае дыялектным фанетычным і лексічным асаблівасцям выразнае прасторавае і культурнае вымярэнне: апісанне окання як яскравай адзнакі поўдня Беларусі факусуе ўвагу на сувязі моўнай рысы з этнаграфічнай спецыфікай рэгіёну. На карысць гэтага эфекту служаць і ілюстрацыі: рысы паўночна-ўсходняга дыялекту суправаджае касцёл у Камаях, што ў Віцебскай вобласці, а на старонцы пра оканне ў паўднёва-заходнім дыялекце размешчаная сядзіба Плятэраў у Заполлі, што ў Пінскім раёне.

Адметная рыса кнігі — гэта QR-коды, якія дазваляюць чытачу непасрэдна звяртацца да мапаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы" і "Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак". Тут можна прачытаць тэкст, паглядзець прыклады і ўбачыць, як тая або іншая моўная асаблівасць распаўсюджана на тэрыторыі Беларусі. QR-коды дазваляюць забяспечыць шматслойную інтэртэкстуальнасць, ведучы таксама на паэтычныя прыклады да лінгвістычных фактаў.

З навуковай перспектывы кніга вызначаецца дакладнасцю і прафесійнай падачай матэрыялу. Яна не прэтэндуе на ролю ўсебаковай

граматыкі або тэарэтычнай манаграфіі, але на сваю мэту – папулярызацыю ведаў пра беларускую мову – працуе бездакорна. Кніга таксама разбурае многія міфы, здымае страхі і стэрэатыпы: аказваецца, што *кукушка, пятух* і *вутка* — гэта не русізмы, а дыялектызмы, а формы загаднага ладу кшталту *пішэце, скажэце* – гэта не памылка, а рыса паўднёва-заходніх гаворак.

Такім чынам, "Як гавораць беларусы" – гэта ўдалае спалучэнне навуковасці, даступнасці і эстэтычнай завершанасці. Выданне дэманструе, што беларуская лінгвістычная нон-фікшн літаратура мае значны патэнцыял для развіцця і запаўнення культурна-асветніцкай нішы, а таксама можа служыць густоўным падарункам для ўсіх аматараў беларускай мовы. Наклад, які імкліва разышоўся, сведчыць пра запатрабаванасць такіх выданняў. Магчыма, кніга Вадзіма Шклярыка паспрыяе больш паважліваму стаўленню да дыялектаў, да мясцовай гаворкі, якая дасталася нам ад дзядоў і прадзедаў, і ўвогуле да беларускай мовы і традыцыйнай культуры.